# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 23 лістапада 2000 года, чацвер, № 14-15 (1826-1827)


ПАДЗЕІ

## ПАД ЗОРКАЙ СЛУЖЭННЯ ІСЦІНЕ

*Да дня нараджэння універсітэт зрабіў сабе падарунак: падчас святкавання 79-й гадавіны БДУ ў дворыку універсітэцкага гарадка з'явіўся яшчэ адзін помнік. На гэты раз – Сымону Буднаму і Васілю Цяпінскаму.*



Ён размясціўся тут на аднолькавых правах з помнікамі Еўфрасінні Полацкай, Францішку Скарыне і Міколу Гусоўскаму. У гэтым няма нічога дзіўнага, бо і Сымон Будны, і Васіль Цяпінскі па праву лічацца ў нашай краіне славутымі асветнікамі. Сымон Будны, напрыклад, разам з паплечнікамі Лаўрэнціем Крышкоўскім, Мацеем Кавячынскім пад патранатам князя Мікалая Радзівіла Чорнага заснаваў друкарню ў Нясвіжы, дзе ў 1562 годзе выдаў першую на тэрыторыі сучаснай Беларусі кнігу на беларускай мове "Катэхізіс" і шэраг іншых кніг, у якіх выявіў сябе таленавітым філосафам і філолагам, гісторыкам і паэтам.

Васіль Цяпінскі ў 1570-х гадах заснаваў на ўласныя сродкі ў сваім маёнтку Цяпіна друкарню і выдаў "Евангелле" са знакамітай прадмовай, якая адрозніваецца ад іншых вядомых прадмоў старадрукароў гарачай публіцыстычнасцю, патрыятычным запалам. Гэта найбольш вядомыя факты з жыцця вялікіх людзей.

Сымон Будны і Васіль Цяпінскі (Амельяновіч) былі паплечнікамі і таварышамі ў гуманістычна-асветніцкай дзейнасці. Таму і ў скульптуры яны выяўлены побач.

Ажыццявіў ідэю таленавіты скульптар Ігар Голубеў, якому належыць цэлы шэраг помнікаў выдатным прадстаўнікам культуры Беларусі. У прыватнасці, Язэпу Драздовічу, Уладзіміру Караткевічу, Еўфрасінні Полацкай. У новай рабоце скульптар выяўляецца як майстар складанай скульптурнай кампазіцыі, якая спалучае ў сабе дынаміку і статыку, гістарычную дакладнасць і набліжанасць да сучаснасці.

На масіўнай сярэднявечнай лаве сядзяць два знакамітыя чалавекі — Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, сядзяць і гавораць пра адвечныя філасофскія праблемы. А паміж імі ёсць вольнае месца, дзе можа прысесці кожны студэнт нашай навучальнай установы і тым самым далучыцца да дыспуту вялікіх людзей. Першым з асветнікамі сфатаграфаваўся рэктар БДУ Аляксандр Уладзіслававіч Казулін. З гэтага дня кожны выпускнік універсітэта таксама мае магчымасць зрабіць каля помніка свой фотаздымак і берагчы яго як своеасаблівую візітоўку "alma mater".

Тое, што універсітэцкі дворык стаў месцам ушанавання сапраўдных асветнікаў, якія прысвяцілі сваё жыццё культуры і развіццю цывілізацыі, вельмі адметна. Гэта значыць толькі адно: БДУ, а разам з ім яго навучэнцы і супрацоўнікі, таксама выбраў сваім лёсам служэнне асвеце і ісціне.

Па словах гісторыка Алега Антонавіча Яноўскага, прарэктара па вучэбнай рабоце, які мае прамое дачыненне да асэнсавання і ажыццяўлення мастацкага ўвасаблення ідэі Універсітэта як найважнейшай сферы грамадскага і культурнага жыцця нашай краіны, кампазіцыя завершыцца помнікам яшчэ аднаму вялікаму асветніку — Кірылу Тураўскаму. Ён з'явіцца побач з іншымі ў наступным годзе, якраз падчас святкавання 80-годдзя нашай навучальнай установы.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*
*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

# ГІСТОРЫЯ ПОЛЬСКІХ РЭФОРМАЎ

*8 лістапада ў Доме дружбы адбылася прэзентацыя кнігі намесніка дэкана факультэта міжнародных адносін БДУ, дацэнта М.Э. Часноўскага "Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989—1999)", якая пабачыла свет у Выдавецкім цэнтры БДУ. Арганізавалі гэтую імпрэзу дэканат факультэта міжнародных адносін і рада Таварыства "Беларусь – Польшча". Мерапрыемства праходзіла ў рамках святкавання Дня незалежнасці Рэспублікі Польшча.*

Аўтар кнігі — гісторык-міжнароднік, у свой час быў саветнікам-пасланнікам, а таксама Часовым Паверaным у справах Рэспублікі Беларусь у Польшчы. З 1993 па 1996 год М.Часноўскі як прафесійны навуковец вывучаў польскія рэформы, знаходзячыся ў гэтай краіне.

Аналізуючы галоўныя змены ў Польшчы на адрэзку большым за 10 гадоў, аўтар зрабіў шматлікія супастаўленні польскіх рэформаў з аналагічнымі пераўтварэннямі ў суседніх краінах. Таму кнігу можна смела назваць гісторыка-філасофскім разважаннем пра сістэмную трансфармацыю постсацыялістычных краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гэтую думку падмацоўвае і апісанне як тыповых для краін з пераходнай эканомікай, так і нацыянальна адметных, чыста польскіх перадумоў, прычын і рысаў пераўтварэнняў.

Каштоўнасць кнігі не толькі ў тым, што яе асобныя палажэнні, па словах аўтара, могуць выкарыстоўвацца як практычная "падказка" ў актывізацыі беларускіх рэформаў, але і ў наватарскім падыходзе. Такога комплекснага і шырокага па ахопу праблем і храналогіі даследавання няма пакуль што ні ў беларускай, ні ў расійскай, ні нават ва ўласна польскай гістарыяграфіі.

У сваім уступным слове Мечыслаў Часноўскі адзначыў, што ў 1989—1999 гадах рэформы ахапілі фактычна ўсе сферы жыццядзейнасці нашай заходняй суседкі. Гэтая асаблівасць і адлюстроўваецца ў назве кнігі тэрмінам "сістэмныя пераўтварэнні". Яны асэнсоўваюцца з комплекснай зменай палітычнай улады, дзяржаўнага кіравання, геапалітычных прыярытэтаў і сацыяльна-эканамічнага ладу жыцця.

Па вялікім рахунку, пераўтварэнні ўдаліся. Калі параўнаць дзве Польшчы (ПНР узору 1989 года і РП узору 1999 года), то ўсе перавагі, безумоўна, на баку сённяшняй Польшчы. За дзесяць гадоў вытворчасць вырасла амаль на 45 працэнтаў: гэта — найлепшы вынік сярод усіх краін нашага рэгіёну (на другім месцы — Славакія: 33 працэнты).

Як зазначыў аўтар, яму імпануе жыццёвы аптымізм палякаў, раней ім мала ўласцівы. Гэтая рыса адлюстроўваецца ў выдатнай прымаўцы: "У Польшчы ўсё магчыма, нават перамены да лепшага".

*Л. МІЦЕЎ*

СУСТРЭЧЫ

# АДЗІНСТВА Ў РАЗНАСТАЙНАСЦІ

З 2 па 6 красавіка 2001 года пройдзе Еўрапейскі тыдзень у Эйндховене (Нідэрланды). Гэта мерапрыемства ўжо ў сёмы раз арганізуюць студэнты Тэхналагічнага універсітэта Эйндховена. На ім сустракаюцца больш за 450 студэнтаў з усёй Еўропы, каб умацоўваць сяброўскія сувязі паміж моладдзю розных краін.

Асноўная падзея Еўрапейская тыдня — канферэнцыя, якая будзе доўжыцца тры дні. На ёй удзельнікі форуму абмяркуюць перспектывы далейшай інтэграцыі краін Еўропы. Апрача таго, у рамках тыдня прадугледжаны інфармацыйная і культурная праграмы, а таксама вечарынкі.

Дэвізам тыдня з'яўляецца выслоўе: "Адзінства ў разнастайнасці. Кім вызнаеш сябе ты?" На думку арганізатараў, падчас працэсу еўрапейскай інтэграцыі вельмі важна захаваць нацыянальную і культурную самабытнасць. Таму сваімі думкамі наконт Еўрапейскага Саюза і яго праблем змогуць падзяліцца людзі рознага ўзроўню адукацыі, розных інтарэсаў і поглядаў.

Арганізатары Еўрапейскага тыдня бяруць на сябе клопат пра харчаванне і пражыванне ўдзельнікаў форуму. Самастойна давядзецца аплаціць толькі праезд і мець грошы на кішэнныя выдаткі.

Заяўкі на ўдзел у Еўрапейскім тыдні арганізатары прымаюць да 1 студзеня 2001 года (дадатковыя звесткі — на сайтах www.ewe2001.com ці www.ewe.stud.tue.nl, e-mail: ewe@ewe.stud.tue.nl). Анкеты і падрабязную інфармацыю можна атрымаць у Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ (пр. Ф. Скарыны, 4, тэл. 206-60-04, e-mail: yri@org.bsu.unibel.by).

*Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ*

НАШЫ ВЫПУСКНІКІ

# *Пра літаратуру і эпігонаў*

Сустрэцца з жывым пісьменнікам удаецца нячаста. Асабліва — з пісьменнікам вядомым.

Такую магчымасць падаравалі студэнтам філалагічнага факультэта нашага універсітэта Фундаментальная бібліятэка БДУ і кафедра беларускай літаратуры XX стагоддзя. 14 лістапада тут адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў факультэта з лаўрэатам Дзяржаўнай і Мележаўскай прэмій празаікам Генрыхам Далідовічам.

На самым пачатку пісьменнік прызнаўся ў любові да сваёй alma-mater — да філфака, які ён скончыў у 1968 годзе. А потым пайшла гаворка пра творчасць, пра літаратуру.

Генрых Вацлававіч распавёў пра тое, як складана давалася яму напісанне і выданне трылогіі "Гаспадар-камень" — твора, прысвечанага пераломнай эпосе ў нашай гісторыі. Для кнігі, якая апісвае падзеі 1917—1919 гадоў, аўтар яшчэ ў савецкія часы карыстаўся матэрыяламі па гісторыі БНР, выдадзенымі на эміграцыі, а таксама закрытымі архіўнымі фондамі. Слухачоў пазабавіла гісторыя пра тое, як эмігранцкія выданні пісьменніку прывезлі пад вокладкай кнігі "Гісторыя КПСС"...

Не праміналі ў гаворцы і дзень сённяшні. І пісьменнік, і слухачы горача абмяркоўвалі актуальныя праблемы беларускай літаратуры. І не дзіва: Генрых Далідовіч ужо не першы год з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Маладосць". І, бадай, мала хто лепей за яго ведае, чым зараз жывуць творцы.

Аднак не толькі літаратура стала тэмай для абмеркавання. Генрых Вацлававіч гаварыў пра цяперашні стан вёскі: параўноўваў яе з вёскай свайго дзяцінства і юнацтва. Адзначыў пісьменнік і тое, што цяперашняя беларуская культура проста не можа быць чыста вясковай: "Мы памыліліся, калі лічылі: толькі вёска — апірышча культуры".

Вядома ж, гэтая сустрэча не была звычайнай акадэмічнай лекцыяй: у аўдыторыі было да Генрыха Далідовіча мноства пытанняў. Але адно з іх варта, на маю думку, працытаваць асобна:

— Ці ёсць у беларускай літаратуры (а можа, з'явяцца) эпігоны Далідовіча?

Такога пытання пісьменнік не чакаў і выглядаў нават крыху прыгаломшаным:

— Я не ведаю, што і адказаць... Эпігонства ніколі нікому не прыносіла карысці.

*Зміцер ДЗЯДЗЕНКА*

З НАГОДЫ

# ДЗЕНЬ СТУДЭНТА

Самае галоўнае студэнцкае свята — Дзень студэнта — у інтэрнаце № 6 пачалі адзначаць яшчэ 15 лістапада. Хол быў ператвораны ў глядзельную залу для ўсіх жадаючых, а на імправізаваную сцэну з гітарамі (а таксама баянамі, скрыпкамі, кантрабасамі) выходзілі "лепшыя галасы" ФПМІ БДУ і "сяброўскіх ВНУ". Ужо праз паўгадзіны пасля пачатку канцэрта чыстая белая падлога была шчыльна заселеная коўдрамі, на якіх размяшчаліся ўдзячныя слухачы. Усе песні: ад лірычных да тых, што прысвячаліся тутэйшым прусакам — прайшлі "на ўра".

*Адэлька ПАПОВА*

# Восеньскі баль самацветаў



Напрыканцы восені, 24—26 лістапада, на геаграфічным факультэце зазззяе ўсімі колерамі вясёлкі "Каменная казка" — выстава мінералаў і вырабаў з іх. Гэтая казка ажыве ўжо ў дванаццаты раз. І, мабыць, аматарам казак, дый проста цікаўным людзям не лішне будзе завітаць у каменнае царства і бліжэй пазнаёміцца з "прынцамі" і "прынцэсамі" чароўнага свету камянёў.

Асноўная мэта выставы-кірмашу — паказаць прыгажосць, непаўторнасць камянёў і сапраўднае ювелірнае мастацтва высокай якасці. У наведнікаў выставы будзе магчымасць атрымаць парады спецыялістаў наконт таго, як выбіраць упрыгожанні і вызначаць іх сапраўднасць. Будуць праводзіцца экскурсіі і кансультацыі. І кожны зможа сам пераканацца, што камяні — сапраўды вялікая таямніца, нездарма пра іх складзеныя легенды і паданні.

Як добрыя знаёмыя сустрэнуцца ў гэтыя дні ў Белдзяржуніверсітэце калекцыянеры, майстры ювелірнай справы, госці з Беларусі, Украіны, Расіі, іншых краін. Кожны год тысячы людзей захапляюцца чароўнай прыгажосцю камянёў — фіялетавым колерам фіялак, аметыстаў, залацістымі промнямі астрафілітаў з калекцыі бабруйскага клуба "Мерыдыян", які ўзначальвае вялікі знаўца сваёй справы В.М. Сакалоў. Цёплыя словы ўдзячнасці хочацца сказаць прафесару А.А. Багдасараву з Брэста: ён вывучае беларускі бурштын і прывязе на выставу цікавую калекцыю. Прымуць удзел таксама выкладчыкі і студэнты Політэхнічнай акадэміі, дзе рыхтуюць спецыялістаў па апрацоўцы камянёў. Прадстаўнікі лагойскага завода "Эпас" прывязуць на выставу вырабы з мармуру, лазурыту, нефрыту і іншых мінералаў і горных парод. Заўжды чаканымі гасцямі на мінскай выставе з'яўляюцца вырабы з афрыканскага малахіту і сонечны камень Калінінградскага бурштынавага камбіната. Не менш цікавыя ўзоры камянёў і вырабы з іх прывязуць з Урала, Сібіры, Казахстана і іншых рэгіёнаў СНД.

Акрамя таго, на выставе можна будзе сустрэць керамістаў, майстроў — разьбяроў па дрэве і інш. А цікаўныя змогуць знайсці тут кнігі па мінералогіі, петраграфіі альбо папулярныя выданні пра камяні — гэтыя кнігі можна будзе і набыць у прыватных калекцыянераў.

На выставе можна пазнаёміцца з абсталяваннем па апрацоўцы камянёў, ультрагукавымі інструментамі для абточвання крышталёў, для прашыўкі адтулінаў і для гравіравальных работ.

"Каменная казка" чакае вас, шаноўныя выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты: прыходзьце на выставу, здзіўляйцеся і зачароўвайцеся, набывайце ўпадабаныя ўпрыгожанні, сувеніры, талісманы. Прыслухоўвайцеся да свайго сэрца, давярайце сваёй інтуіцыі — і вы не памыліцеся. Камень натхняе сваімі цудоўнымі фарбамі і гульнёй колераў. Ён абавязкова дапаможа студэнтам атрымліваць выдатныя адзнакі, забяспечыць поспех навукоўцам...

Заходзьце, знайсці выставу зусім не складана — яна месціцца ў корпусе геаграфічнага факультэта. Тут з 10 да 19 гадзін будуць рады бачыць кожнага.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*



## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

старшага навуковага супрацоўніка Цэнтра праблем развіцця адукацыі БДУ;

малодшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі элементаарганічнага сінтэзу;

малодшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі геаэкалагічных праблем;

навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі гідраэкалогіі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 107, тэл. 209-51-65, 226-47-64.*

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

загадчыка лабараторыі тэхнічнай дыягностыкі;

загадчыка лабараторыі акустычнай дыягностыкі;

загадчыка лабараторыі вібраакустыкі;

вядучага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці фізіка цвёрдага цела;

старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці элементы і прылады вылічальнай тэхнікі і сістэм кіравання;

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці вылічальная матэматыка;

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці аўтаматызацыя фізічных даследаванняў;

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці радыёфізіка.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэл. 277-48-43, 277-56-17.*

## ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

*Лабараторыя ядзернай оптыкі:*

загадчык лабараторыі (1 чалавек);

вядучы навуковы супрацоўнік (3 чалавекі);

старшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

малодшы навуковы супрацоўнік (3 чалавекі);

*Лабараторыя рэлятывісцкай ядзернай фізікі:*

вядучы навуковы супрацоўнік (2 чалавекі);

навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

*Лабараторыя аналітычных даследаванняў:*

навуковы супрацоўнік (2 чалавекі);

*Лабараторыя вымяральных сістэм:*

загадчык лабараторыі (1 чалавек);

старшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

малодшы навуковы супрацоўнік (2 чалавекі);

*Лабараторыя фізічнай кінетыкі і вылічальнага эксперыменту:*

загадчык лабараторыі (1 чалавек);

старшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

малодшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

загадчык сектара эксперыментальных даследаванняў (1 чалавек).

*Лабараторыя лазернай фізікі:*

загадчык лабараторыі (1 чалавек);

вядучы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

малодшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек).

*Лабараторыя тэарэтычнай фізікі:*

вядучы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

старшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

загадчык аддзела кагерэнтных і нелінейных працэсаў (1 чалавек).

*Лабараторыя фізікі хуткабежных працэсаў:*

загадчык лабараторыі (1 чалавек);

старшы навуковы супрацоўнік (1 чалавек).

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220050, г. Мінск, НДІ ЯП, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.*

# УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ЖАНЧЫНЫ

Як бы ні імкнуліся жанчыны да роўнасці ў правах з мужчынамі, але галоўны іх абавязак — заўсёды выглядаць прыгожа — застанецца з імі назаўсёды.

Тое, што мы разумеем пад словам "стыльны", разглядаецца як адметная рыса асобных мужчын, а вось для жанчын — гэта неабходнасць. Гэта лічыцца часткай яе натуры, часткай жаноцкасці. Дзяўчына знойдзе сродкі і час, каб у патрэбны момант быць самай лепшай, але наколькі прасцей зрабіць гэта, калі ты сябруеш са швейнай машынкай і можаш сама зрабіць сабе "стыльную" рэч.

Апранаць сябе накшталт таго, як апраналі ў дзяцінстве лялльку Барбі, вучацца студэнткі розных факультэтаў БДУ ў студыі кройкі і шытва, размешчанай у інтэрнаце БДУ № 6. Запраўляе тут усім Ніна Паўлаўна Яцкевіч. Яна скончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, мае вялікі вопыт працы. Вось і вырашыла падзяліцца з маладымі дзяўчатамі сваімі сакрэтамі. Расійскі мадэльер Аліса Фаміна аднойчы сказала фразу, якую ў студыі зрабілі сваім дэвізам: "Мне не шкада жанчын, кепска апранутых. Гэта альбо ад недаверу да сябе, альбо — не вельмі патрэбна. Тут усё залежыць ад нас. Варта толькі вельмі захацець". Ніна Паўлаўна перакананая, што навучыцца шыць можа кожная дзяўчына. Толькі трэба адчуць памкненне да гэтага і каб хтосьці крышачку дапамог, падказаў.

Калі Ніне Паўлаўне прыйшла ў галаву ідэя арганізаваць курсы, яна нават сама не думала, што так хутка ўсё пачнецца. Пяць машын адшукаліся ў "загашніках" універсітэта. Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў, былы дырэктар студгарадка, падтрымаў ініцыятыву: студыі набылі аверлок, прас Roventa і прасавальную дошку. Прыстасавалі да справы адзін з пустых пакояў-залаў інтэрната № 6. Навучальныя групы сабраліся вельмі хутка. Тыя, хто прыйшоў сюды ў лютым, ужо даўно красуюцца ў новых сукенках, спадніцах, штанах і з гонарам паказваюць сяброўкам на факультэце і ў інтэрнаце вынікі свайго рамяства. У студыі праходзяць пераважна практычныя заняткі, таму што галоўнае, па словах выкладчыцы, — дапамагчы дзяўчынкам узбагаціць уласны гардэроб.

Добра ўладкаваліся на першым паверсе Ніна Паўлаўна і дваццаць дзяўчат, якія прыходзяць не толькі вучыцца, але і падзяліцца марамі, сакрэтамі і праблемамі, проста пагутарыць. Ніна Паўлаўна кажа, што ёй дзяўчынкі расказваюць усё, як маці.

*Аліса БІЗЯЕВА*



*Ніна Паўлаўна Яцкевіч*



*Сем разоў адмерай...*

***Ад рэдакцыі.*** *Тыя, хто хоча займацца ў разнастайных гуртках і студыях, могуць звяртацца ў студгарадок (пакой 114), які знаходзіцца па адрасе: вул. Кастрычніцкая, 4. Акрамя таго, інфармацыю пра тое, як найбольш цікава арганізаваць свой вольны час, вы знойдзеце ў "Беларускім універсітэце" № 12 за 12 кастрычніка 2000 года.*



*Хутка з'явіцца абноўка*



*Пошук новых мадэляў*

ПАДПІСКА-2001

## "ВЕСНІК БДУ"

Пачалася падпіска на **"Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта"** — адзіны ў рэспубліцы навукова-тэарэтычны часопіс шырокага профілю, які асвятляе дасягненні беларускіх вучоных у галіне фундаментальных, прыкладных, грамадскіх і гуманітарных навук.

**"Веснік БДУ"** паступае ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і навуковыя цэнтры больш чым 30 краін блізкага і далёкага замежжа, уваходзіць у пералік выданняў, зацверджаных ВАК РБ пры абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Падпісная цана на часопіс **"Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта"** на першае паўгоддзе 2001 года па серыях наступная:

Серыя І (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):
індывідуальная — 2027 р.;
ведамасная — 3854 р.

Серыя ІІ (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):
індывідуальная — 2027 р.;
ведамасная — 3854 р.

Серыя ІІІ (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):
індывідуальная — 1013 р.;
ведамасная — 1927 р.

Серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):
індывідуальная — 1013 р.;
ведамасная — 1927 р.

Падпісацца на часопіс **"Веснік БДУ"** можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ВУЧЫЦЦА НАВУКОВАМУ МЫСЛЕННЮ

Вучэбна-навукова-практычная канферэнцыя "Навучальныя веды як аснова з'яўлення культурных формаў ва універсітэцкай адукацыі (Навучальныя веды. Універсітэт. Культура)" прайшла 14-15 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Адна з асноўных тэм, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі, — навуковыя і навучальныя веды ў сучасным універсітэце. Першыя — гэта змест навуковых манаграфій, а другія — трансфармаваны варыянт першых, якія студэнтам выкладаюць на лекцыях у ВНУ. Рэальна ў сучасным універсітэце пануюць навучальныя веды: студэнт атрымлівае спрошчаную гатовую інфармацыю, над якой не трэба думаць і рабіць высновы. Таму ў нядаўняга школьніка не заўсёды развіваецца навуковае мысленне, якое з'яўляецца рухавіком навукі.

У абмеркаванні праблем універсітэцкай адукацыі прымалі ўдзел навукоўцы з Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі і Украіны. Напрыканцы канферэнцыі па выніках яе працы прайшоў "круглы стол".

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

## Кіно без перакладу

У кастрычніку адкрыўся чацвёрты сезон у Польскім відэаклубе. Так называецца адна з праграмаў Польскага інстытута ў Мінску, накіраваная на пашырэнне ведаў пра Польшчу, польскую культуру.

Адкрыў кінапаказ, як заўсёды, каардынатар праекта "Польскі відэаклуб" кандыдат філасофскіх навук, дацэнт РІВШ БДУ Максім Жбанкоў. Ён паведаміў, што да апошняга моманту чакалі прыезду дырэктара Польскага інстытута ў Мінску, але нешта не атрымалася ў шаноўнага госця... Зрэшты, адсутнасць афіцыйнай асобы ніколькі не зашкодзіла вечару быць цікавым і прыемным.

На першым кінапаказе гледачы змаглі паглядзець гангстэрскую кінакамедыю Мацея Дуткевіча "Фарт" з абаяльным Мацеем Штурам у галоўнай ролі. Тут было ўсё: пагоні, спакушэнні, выкраданні і прыз у выглядзе $200 000. Можаце паверыць — не горш, чым гэта атрымліваецца ў галівудскіх кінарэжысёраў.

Пасля кінапаказу спадар Жбанкоў пагадзіўся распавесці чытачам "Беларускага універсітэта" пра польскія фільмы і праект "Польскі відэаклуб".

Ён паведаміў, што праект, ініцыяваны Польскім інстытутам у Мінску, існуе ўжо тры гады. Увесь гэты час паказ фільмаў адбываецца на філалагічным факультэце нашага універсітэта: кіраўніцтва філфака пайшло насустрач арганізатарам праекта і прадаставіла сталае памяшканне. Зрэшты, яно і зразумела: на філфаку, як вядома, вывучаюць польскую мову, а праграма кінапаказаў знаёміць гледачоў і з размоўнай польскай мовай, і з культурай нашай бліжэйшай заходняй суседкі. Ходзяць на гэтыя кінасеансы не толькі студэнты, бо ўваход вольны для ўсіх.

Па словах каардынатара праекта, ад самага пачатку ў дзейнасці Польскага відэаклуба існавалі два накірункі. Арганізатары імкнуліся пазнаёміць гледачоў не толькі з навінкамі польскага кінематографа, але і з фільмамі, якія ўжо сталі класікай.

*Зміцер ДЗЯДЗЕНКА*

АКТУАЛЬНА

## ДЫЯЛОГ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

Значная для Рэспублікі Беларусь падзея адбылася ў Мінску ў кастрычніку — міжнародны кангрэс "Навука і адукацыя на парозе III тысячагоддзя". Ён праходзіў пры падтрымцы і непасрэдным удзеле такіх замежных і айчынных арганізацый, як ЮНЕСКА, Расійская акадэмія навук, Міністэрства адукацыі Расіі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях і інш.

Кангрэс сабраў вядомых навукоўцаў і арганізатараў навукі з 23 краін свету. Праца кангрэсу вялася на пленарных пасяджэннях і 14 тэматычных секцыях і "круглых сталах". Матэрыялы кангрэсу апублікаваныя ў зборніку "Навука і адукацыя на парозе III тысячагоддзя" (агульны аб'ём кнігі — больш за 600 старонак).

У тэзісах кангрэсу можна знайсці і мноства імёнаў навукоўцаў і выкладчыкаў БДУ. Даклад на тэму "Універсітэт у дынамічным свеце" падрыхтаваў рэктар нашага універсітэта А.У. Казулін разам з першым прарэктарам А.І. Жуком.

Дзейнасць адной з секцый ("Актуальныя праблемы трансфармавання адукацыі") адбывалася ў нашым універсітэце. Кіраўніком секцыі быў рэктар БДУ А.У. Казулін, сакратаром — дырэктар Цэнтра праблем развіцця адукацыі БДУ М.А. Гусакоўскі. Менавіта супрацоўнікі Цэнтра выканалі асноўную арганізацыйную працу: экспертны аналіз дасланых матэрыялаў, складанне праграмы працы секцыі, перапіска з удзельнікамі кангрэсу, іх сустрэча, рэгістрацыя, арганізацыя культурнай праграмы. Самыя спрыяльныя ўмовы для працы былі створаны прарэктарамі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ С.І. Максімавым і Я.С. Яскевічам, на базе якога адбывалася праца секцыі.

Наогул жа ў працы секцыі прынялі ўдзел больш за 40 вучоных, сярод якіх 9 прафесараў і 23 кандыдаты навук. Дыяпазон абмеркаваных тэм быў вельмі шырокім: ад нацыянальнай дактрыны адукацыі ў Расійскай Федэрацыі да камерцыялізацыі адукацыі і ўяўленняў пра адукацыю як прадпрымальніцкую дзейнасць.

Асноўная дыскусія разгарнулася вакол трох галоўных тэм: адукацыя і навука: праблема новага сінтэзу; адукацыя і рынак: камерцыялізацыя адукацыйнай дзейнасці; студэнты: змена іх становішча і ролі ва ўмовах трансфармацыі сучаснай адукацыі.

Асаблівы інтарэс выклікала праблема адрознення функцый навукі і адукацыі. Удзельнікі секцыі адзначалі спрошчанасць уяўлення, нібы навука "робіцца" асобна ў навуковых лабараторыях, а задача адукацыі — "давесці" яе да розуму студэнтаў, нібы адукацыя — гэта толькі распрацоўка адукацыйных тэхналогій. Адзначалася, што ў адукацыі ёсць свая роля ў культуры, якая не зусім супадае з вядучай функцыяй навукі. Калі задача навукі, па вялікім рахунку, прагматычная: стварэнне новых тэхналогій, — то функцыя адукацыі — захаванне чалавечага ў культуры. І далёка не заўсёды адукацыя звярталася да навукі, вырашаючы гэтую сваю задачу: быў час, калі гэтую функцыю выконвала рэлігія ці мастацтва. Роля адукацыі сёння — не проста кансерватыўная падтрымка сацыяльнай стабільнасці (status quo), а стварэнне новых спосабаў падтрымкі сацыяльнай салідарнасці ва ўмовах трансфармацыі грамадства.

Удзельнікі кангрэсу адзначалі, што камерцыялізацыя адукацыі не павінна адмяняць задачу дзяржавы — інстытуцыянальных інвестыцый, дзякуючы якім ажыццяўляецца адзіная адукацыйная палітыка ў грамадстве і ствараюцца гарантыі сацыяльных правоў чалавека. Камерцыялізацыя адукацыі не павінна зачыняць дзверы ў навуку перад студэнтам і саіскальнікам.

Дакладчыкі ўзнялі некалькі вострых праблем, якія датычацца навучання студэнтаў у ВНУ. Як асаблівa актуальная праблема адзначалася неабходнасць з'яўлення новага пакалення сучасных падручнікаў і пераходу да новых тэхналогій навучання. Абмяркоўваліся на канферэнцыі такія адмоўныя тэндэнцыі, як квота на ўдзел студэнтаў у навуковых канферэнцыях, цяжкасці з публікацыяй студэнцкіх навуковых прац.

Па выніках дзейнасці секцыі ўдзельнікі зрабілі некалькі высноў. У сучаснай адукацыі можа і павінна забяспечвацца магчымасць і свабода светапоглядняга выбару. Менавіта гэтая ўмова і стварае магчымасць пераацэнкі каштоўнасцяў, змены арыенціраў, з'яўленне чалавека, здольнага дамовіцца, — уменне кожнага заняць пазіцыю ў дыялогу культур. Як адзначыў у сваім дакладзе акадэмік РАН В.С. Сцёпін, гэта — адно з самых важных умельстваў пры пераходзе ад тэхнагеннай цывілізацыі да антрапагеннай.

Актуальнай назвалі на секцыі неабходнасць у выпрацоўцы крытэрыяў размежавання навуковых і ненавуковых ведаў. Вырашэнне гэтай праблемы можа разглядацца як сацыяльны заказ з боку адукацыі да фундаментальнай навукі і філасофіі: сучаснаму універсітэту неабходна мець крытэрыі, па якіх праводзіцца адбор зместу адукацыі.

Кангрэс спрыяў выпрацоўцы крытычнага мыслення, новых падыходаў у вырашэнні актуальных праблем сучаснасці і стаў важнай вяхой у гісторыі сучаснай навукі, адукацыі і культуры.

*Вольга ШАРКО,*
*метадыст Цэнтра праблем развіцця адукацыі БДУ*

# Характар чалавека можна дазнацца



*Госць "Беларускага універсітэта" — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі фізічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Ілля Давыдавіч Феранчук. Адзін з накірункаў яго навуковай дзейнасці – удасканаленне розных тыпаў крыніц рэнтгенаўскага выпраменьвання з перастройваемай частатой. Рэнтгенаўскае выпраменьванне шырока выкарыстоўваецца ў медыцыне, у прыватнасці ў дыягностыцы хвароб, звязаных з парушэннямі клетак, а таксама ў фізіцы лекавых прэпаратаў, у даследаванні структуры паўправаднiковых матэрыялаў. Другі накірунак ягоных заняткаў (больш тэарэтычны) звязаны з распрацоўкай новых метадаў апісання квантавых сістэм. Сам Ілля Давыдавіч – выхадзец са школы Уладзіміра Рыгоравіча Барышэўскага. Цяпер жа і ў яго самога ёсць нямала вучняў, якія паспяхова працуюць у розных краінах свету.*

*Але сёння размова пойдзе не пра навуковыя дасягненні ў фізіцы, а пра яго незвычайнае захапленне – брыдж. Можна сказаць, ён быў адным з заснавальнікаў гэтай гульні ў Беларусі, доўгі час узначальваў Беларускі саюз спартыўнага брыджа, напісаў некалькі кніжак па гульні ў брыдж і шмат робіць для таго, каб вядомая ва ўсім свеце гульня стала папулярнай і ў нашай краіне. Дарэчы, брыдж ужо прызнаны Міжнародным алімпійскім камітэтам як від спорту, а ў 2006 годзе спартыўны брыдж плануецца ўключыць у Алімпійскія гульні.*

**— Ілля Давыдавіч, што ж такое брыдж?**

— Брыдж — адна са спартыўных лагічных гульняў. Гэта гульня картамі, якія выконваюць такую ж ролю, як, напрыклад, фігуры ў шахматах. У брыджы заўсёды гуляюць чатыры чалавекі, якія ствараюць дзве пары.

Можна сказаць, што брыдж — своеасаблівая мадэль жыцця. У свой час Бісмарк сказаў, што калі хочаш даведацца пра характар чалавека, пагуляй з ім паўгадзіны ў карты. У жыцці праходзіць шмат часу, пакуль сустрэнецца якая-небудзь сітуацыя, дзе б чалавек паказаў сваю сутнасць. У картах жа мадэлі жыццёвых сітуацый у канцэнтраваным выглядзе сустракаюцца пастаянна. У працэсе гульні чалавеку неабходна хутка прымаць рашэнні... Таму за кароткі час вы можаце, паназіраўшы за чалавекам, зразумець яго характар.

> *На пачатку 60-х гадоў брыдж у СССР забаранілі разам з жаночай цяжкай атлетыкай і жаночым футболам.*

У брыджы ёсць свае нарматывы, класіфікацыя ігракоў па майстэрстве, праводзяцца чэмпіянаты свету, кантынентаў, асобных краін. Брыдж уваходзіць у Міжнародны алімпійскі камітэт, які ў 1995 годзе прыняў важнае рашэнне аб прызнанні шахмат і спартыўнага брыджа відамі спорту. Да гэтага лічылася, што спорт — гэта развіццё толькі якіх-небудзь фізічных якасцей чалавека. Ужо ў 2002 годзе пройдуць паказальныя выступленні, а ў 2006 плануецца ўключыць спартыўны брыдж у Алімпійскія гульні.

**— А які на сённяшні дзень статус брыджа ў Беларусі?**

— У нашай краіне існуе Беларускі саюз спартыўнага брыджа. Яго разам з аб'яднаннямі па іншых відах спорту курыруе Міністэрства спорту і турызму.

> *Брыдж — спаборніцтва інтэлектаў.*

Афіцыйна ў Беларускім саюзе спартыўнага брыджа зарэгістравана каля 200 чалавек. Для параўнання, Польскі саюз па брыджы — гэта каля 30 тысяч чалавек, хаця там людзей, якія ўмеюць гуляць у брыдж, каля 2 мільёнаў. У Сусветную брыджавую федэрацыю ўваходзяць каля 100 нацыянальных, у Еўрапейскую лігу — 48, у тым ліку і наш саюз.

Калі казаць пра міжнародныя званні (на жаль, у Беларусі такіх пакуль няма), то яны крыху адрозніваюцца па назвах ад тых, якія ёсць, напрыклад, у шахматах. У брыджы, напрыклад, не гросмайстар, а "Life master" — пажыццёвы майстар. Альбо ёсць яшчэ "World life master" — сусветны пажыццёвы майстар.

> *У 2006 годзе спартыўны брыдж плануецца ўключыць у Алімпійскія гульні.*

**— Якім чынам Вы самі захапіліся брыджам?**

— Было гэта напрыканцы 70-х гадоў. Спачатку збіраліся кампаніяй і гулялі ў прэферанс. Аднойчы даведаліся, што ёсць гульня больш складаная і цікавая — брыдж. Выпадкова высветлілася, што на нашай кафедры ёсць прафесар, які ўмее іграць у брыдж. А навучыўся ён гэтай гульні яшчэ да Другой сусветнай вайны, калі быў студэнтам Варшаўскага універсітэта. Ён даў нам літаратуру. З цягам часу і мы засвоілі гэтую гульню. Пазнаёміліся з брыджыстамі з іншых рэспублік. У той час, дарэчы, гэта было больш папулярна ў Прыбалтыцы, Маскве і Санкт-Пецярбургу. У Беларусі мы, фактычна, былі першапраходцамі. Канешне, былі людзі, якія нешта чулі пра брыдж, але гуляць ніхто не ўмеў.

Наогул, брыдж, яго спартыўная мадыфікацыя, узнік на пачатку стагоддзя ў Англіі і ЗША, хаця проста як картачная гульня брыдж існаваў і раней.

У свой час брыдж развіваўся ў СССР, але на пачатку 60-х гадоў вырашылі яго забараніць разам з жаночай цяжкай атлетыкай і жаночым футболам. Чамусьці ў нашым грамадстве склалася пэўнае негатыўнае стаўленне да ігральных картаў. Можа быць, таму, што гэта звязана з азартам, жаданнем выйграць... Яшчэ ў мінулым стагоддзі цар забараніў карты, таму што імі вельмі захапляліся чыноўнікі. Былі выпадкі, калі людзі прайгравалі ўвесь свой скарб. А вінавацілі ў гэтым не чалавека, а карты. Магчыма, і гэта выклікае пэўныя асацыяцыі.

Але важна падкрэсціць, што ў спартыўным брыджы не гуляюць на грошы. Таксама, як у любым спорце, прызамі з'яўляюцца кубкі,

# за паўгадзіны гульні ў карты



званні чэмпіёнаў свету. Хаця ў некаторых краінах, напрыклад, у Польшчы, пераможцы алімпіяд па брыджы атрымліваць і грашовыя ўзнагароды.

Ды і само паняцце азарту доўгі час мела крыху негатыўнае адценне. А паходзіць гэта слова ад французкага "хазард", што азначае проста "выпадак". Узнікла яно тады, калі навукоўцы ўпершыню стваралі тэорыю верагоднасці і падчас эксперыментаў для абгрунтавання некаторых сваіх мадэляў выкарыстоўвалі звычайныя ігральныя карты. Таму што карты — гэта ідэальная мадэль для стварэння выпадковых сітуацый. Цяпер жа ў гэтым дапамагае камп'ютэр. Вось так слова "выпадак" стала "азартам".

*Каб навучыцца гуляць у брыдж, ты павінен прыкласці пэўныя намаганні — такія ж, напрыклад, як і ў вывучэнні замежнай мовы.*

**— Ці лёгка знайсці партнёра для гульні ў брыдж?**

— На пачатковай стадыі, у так званых сацыяльных клубах, дзе мэтай ставіцца перш за ўсё не спартыўныя дасягненні, а цудоўная магчымасць наладзіць зносіны, цікава правесці час, можна гуляць з любым чалавекам. І на самой справе такіх людзей каля 90 %.

Важна, што ў брыджы вы можаце спаборнічаць з чалавекам любога ўзросту і ў любой вагавай катэгорыі, у адрозненне ад іншых відаў спорту.

У брыджы вельмі важная псіхалагічная падрыхтоўка і жыццёвы вопыт. Таму ў добрых ігракоў спартыўнае жыццё доўгае. На чэмпіянатах свету ёсць людзі 70-гадовага ўзросту.

Калі ж у вас больш высокія амбіцыі, то знайсці сабе партнёра ў брыджы вельмі цяжка. Нават больш складана, чым знайсці спадарожніка ў жыцці. Таму пар, якія існуюць у спартыўным брыджы на працягу 2-3 гадоў, не шмат. Людзі могуць пакрыўдзіцца адзін на аднаго нават з-за дробязі. Тут адыгрывае ролю рознае псіхалагічнае ўспрыманне аднолькавых падзей. Нядаўна быў цікавы выпадак з адной амерыканскай парай, якая гуляла разам каля 30 гадоў. У іх былі вялікія дасягненні, не пераўзыдзеныя да гэтага часу. І вось у мінулым годзе на адным з турніраў яны пасварыліся з-за нейкай дробязі і разбегліся.

*Мужу і жонцы лепш не гуляць у партнёрстве...*

Каб не ўзнікала падобных выпадкаў, галоўнае, каб псіхалагічна партнёры глядзелі на аднолькавыя падзеі амаль аднолькава. Напрыклад, на такія сітуацыі, як памылка партнёра, паражэнне, перамога.

Так што мужу і жонцы лепш не гуляць у партнёрстве...

**— Чаму?**

— Падчас гульні могуць узнікнуць такія сітуацыі, у якіх раптам высветліцца, што чалавек зусім не такі, якім падаецца ў жыцці. Простая рэч — у жыцці муж і жонка ўжо прыстасаваліся адзін да аднаго, нехта з іх, напрыклад, лідэр і г.д. А за картачным сталом усё можа быць наадварот. І гэта часам выклікае непаразуменне. Такія выпадкі нават апісаны ў энцыклапедыях па брыджы. І на асабістым вопыце я гэта магу пацвердзіць.

*У маёй сям'і ўсе гуляюць у брыдж, нават цешча, якая пачала гуляць яшчэ ў маладосці, калі навучалася ў Віленскай гімназіі.*

**— А як да Вашага захаплення брыджам ставіцца Ваша сям'я?**

— У маёй сям'і ўсе гуляюць у брыдж, нават цешча, якая пачала гуляць яшчэ ў маладосці, калі навучалася ў Віленскай гімназіі. А ёй ужо 80 гадоў.

**— Чым дапамагае Вам брыдж у жыцці?**

— Калі казаць аб прыняцці рашэнняў, то і ў жыцці, і ў брыджы шмат агульнага. Я магу расказаць пра канкрэтны выпадак, калі мне дапамог брыдж. Аднойчы я быў на стажыроўцы ў Берліне. Зразумела, што ў выхадныя трэба было сябе чым-небудзь заняць. А куды можна пайсці ў незнаёмым горадзе? Я ведаў, што ў Берліне ёсць 7-8 брыджавых клубаў. А там пазнаёміўся з брыджыстамі, і праблема з вольным часам вырашылася. Тым больш было прыемна, калі ў першы ж вечар я выйграў індывідуальнае першынство.

**— Скажыце, калі ласка, колькі часу трэба для таго, каб навучыцца гуляць у брыдж?**

— Напрыклад, у Амерыцы курс навучання складаецца з 32 заняткаў па 4 гадзіны. Я распрацаваў свой курс на базе гэтага: ён складаецца з 16 заняткаў па 4 гадзіны. Карацей кажучы, прыкладна за два месяцы можна навучыцца. Але каб гульня была больш цікавай, вельмі важна павышаць сваё майстэрства. Таму што поспех залежыць ад сумеснай гульні партнёраў. Дарэчы, у свеце няма брыджавых вундэркіндаў — гэта значыць няма людзей, якія б вельмі хутка ўзняліся на вышэйшыя ступені рэйтынгу, як, напрыклад, бывае ў шахматах. Лічыцца, што для таго, каб у брыджы ўзняцца на больш высокі ўзровень, трэба як мінімум 10-15 гадоў прымаць удзел у розных першынствах. Акрамя тэхнікі гульні, якой трэба дасканала валодаць, важна навучыцца ўзаемадзейнічаць з партнёрам, а гэта ў брыджы самае складанае.

Можна сказаць, што брыдж — спаборніцтва інтэлектаў. І тут важна не толькі індывідуальная псіхалагічная падрыхтоўка, але і ўменне прымаць рашэнні разам з партнёрам, камандай.

Трэба адзначыць, што, напрыклад, у Галандыі, Швецыі сістэма навучання дзяцей гульні ў брыдж пачынаецца з 9 гадоў. У нас гэта пакуль немагчыма ўявіць. І наогул, цяжка зразумець, што для таго, каб навучыцца гуляць у брыдж, ты павінен прыкласці пэўныя намаганні — такія ж, напрыклад, як і ў вывучэнні замежнай мовы. І таму многія людзі, якія пачынаюць вучыцца іграць, хутка ад гэтага адыходзяць.

*У многіх краінах брыдж — адзін з элементаў дыпламатычнай адукацыі, таму што гэта цудоўны спосаб зносін.*

Дарэчы, у Галандыі ёсць выкладчыкі брыджа, якія займаюцца гэтым прафесійна. Яны могуць атрымаць званне брыджавы прафесар, брыджавы дацэнт. Людзі заканчваюць курсы, атрымліваюць пасведчанне, атэстацыю і г.д.

У многіх краінах людзі пачынаюць актыўна гуляць тады, калі ўжо выходзяць на пенсію — такіх прыкладна 70 працэнтаў. Яны бяруць спецыяльныя ўрокі па брыджы. Падарожнічаюць і прыемна бавяць час у кампаніі такіх жа брыджыстаў, якіх вельмі шмат па ўсім свеце. Зразумела, што гэта могуць дазволіць сабе людзі забяспечаныя. Вельмі папулярны брыдж і сярод жонак багатых людзей.

Важна падкрэсліць наступнае: калі брыдж прызнаецца алімпійскім відам спорту, то з'яўляецца новы стымул фінансавання брыджавых спаборніцтваў. У Амерыцы цяпер вельмі модна багатаму чалавеку мець яшчэ які-небудзь тытул — напрыклад, алімпійскага чэмпіёна свету. І многія бізнесмены ствараюць свае каманды, дзе гуляюць разам з прафесіяналамі. Ездзяць на спаборніцтвы, павышаюць сваё майстэрства. І ў рэшце рэшт (ёсць такія прыклады) становяцца чэмпіёнамі Амерыкі. Той жа Біл Гейц, адзін з самых багатых людзей свету, таксама брыджыст.

У многіх краінах брыдж — адзін з элементаў дыпламатычнай адукацыі, таму што гэта цудоўны спосаб зносін.

Між іншым, ужо на працягу многіх гадоў ладзіцца штогадовы брыджавы турнір паміж англійскай Палатай лордаў і амерыканскай Палатай прадстаўнікоў. Так што за мяжой брыдж уваходзіць у "джэнтльмэнскі набор" разам, напрыклад, з гольфам і тэнісам.

*Дарэчы, да Алімпійскіх гульняў застаецца яшчэ 6 гадоў, так што, сябры, вучыцеся гуляць у брыдж: у вас ёсць шанс! А з Беларускім саюзам спартыўнага брыджа, які ўзначальвае Алег Тадэвушавіч Градоўскі, можна звязацца па тэлефоне 227-22-20.*

*Гутарыла Таццяна КАЗАК*

# Студэнцкая восень



Інтэрнат. Якія асацыяцыі ўзнікаюць у вас пры гэтым слове? Студэнтам інтэрната № 7 перш за ўсё на памяць прыходзяць словы "свята" і "весялосць". І не дзіва, толькі ў кастрычніку тут прайшлі два цудоўныя мерапрыемствы.

Найбольш прывабіла ўвагу конкурсная шоу-праграма "Лэдзі Восень". Пяць абаяльных дзяўчат спрачаліся за тытул лэдзі. Іх чакалі нялёгкія выпрабаванні: трэба было раскрыць свой вобраз, прадэманстраваць уменне трымацца на сцэне, танчыць, рабіць прычоску, выявіць акцёрскі талент, здольнасці манекеншчыцы і дызайнера па касцюмах. Хаця конкурс праходзіў толькі 26 кастрычніка, чуткі пра яго бударажылі інтэрнат і факультэты (філалагічны і механіка-матэматычны) на працягу ўсяго месяца. На запрашальныя квіткі на праграму пачалося сапраўднае паляванне...

У журы конкурсу ўвайшлі намеснік дырэктара студгарадка БДУ па выхаваўчай працы А.С. Невар, намеснік дырэктара псіхалагічнага цэнтра БДУ Р.П. Папок, педагог-арганізатар студгарадка С.В. Далганюк, мастацкі кіраўнік студыі "Пластыка" І.А. Кіне, сацыяльны педагог інтэрната В.В. Якжык. Аднак выбраць самую лепшую "лэдзі" нават такому журы было няпроста. І пасля доўгіх і палкіх спрэчак тытул "Лэдзі Восень" быў прысуджаны студэнтцы першага курса філалагічнага факультэта Вользе Жэляк.

Безумоўна, і астатнія дзяўчаты былі сапраўднымі лэдзі: "Лэдзі Грацыя" – Таццяна Валоснік (філфак), "Лэдзі Чароўнасць" — Таццяна Булаўка (філфак), "Лэдзі Усмешка" — Таццяна Шаганава (мехмат), "Лэдзі Экстравагантнасць" — Юлія Куроўская (філфак). Дзякуючы Апякунскаму савету студэнцкага гарадка ўсе ўдзельніцы конкурсу атрымалі памятныя падарункі, а Лэдзі Восень – яшчэ і запрашальны квіток на святочную праграму, прысвечаную дню нараджэння нашага універсітэта.

Вядома ж, для большасці прысутных галоўным былі ўсё ж не тытулы і падарункі, а незабыўная атмасфера свята, прыгажосці і весялосці, якую ўдала падтрымлівалі Вікторыя Андрабайла і Вячаслаў Піпко...

І не паспелі яшчэ адысці ў мінуўшчыну ўражанні ад конкурсу, а 31 кастрычніка насельнікі інтэрната № 7 адзначалі ўжо наступнае свята – Halloween. У гэты вечар хадзіць у інтэрнаце, а пагатоў з'яўляцца на дыскатэцы можна было толькі ў маскарадным касцюме ці масцы. Фантазія і вынаходлівасць студэнтаў не ведалі межаў! Як высветлілася, інтэрнат насяляе такая нечысць, такія вычварныя істоты!...

Студэнты ўмеюць адпачываць, весяліцца і радавацца жыццю. А вы так можаце?

*Юлія КУРОЎСКАЯ,*
*студэнтка ІІ курса*
*філалагічнага факультэта*

# СПАРТАКІЯДА ПАМІЖ ІНТЭРНАТАМІ

Штогод паміж інтэрнатамі БДУ праводзіцца Спартакіяда па васьмі відах спорту: баскетбол, плаванне, шахматы, настольны тэніс, гіравы спорт, футбол, перацягванне каната, спартыўнае арыентаванне. Спартакіяда мае два туры: спярша спаборніцтвы праходзяць унутры кожнага інтэрната, дзе высвятляюцца лідэры па асобных відах спорту, а потым – за прызавыя месцы спрачаюцца ўжо самі інтэрнаты, высвятляючы, які з іх самы спартыўны.

Правядзенне гэтай Спартакіяды ўжо стала добрай традыцыяй. Арганізуюць усе спаборніцтвы студэнцкі гарадок нашага універсітэта і кафедра фізвыхавання і спорту БДУ. А прызы пераможцам прадаставіў Апякунскі савет студэнцкага гарадка БДУ.

У рамках Спартакіяды ў кастрычніку прайшлі спаборніцтвы па перацягванні каната на першынство паміж інтэранатамі. Пераможцам стаў інтэрнат № 4, за ім ідуць інтэрнаты № 3 і № 2. У каманду-пераможцу ўваходзяць Алег Талерчык, Уладзімір Скобелеў, Раман Коўчур, Дзмітрый Заплешнікаў (студэнты 5-га курса юрыдычнага факультэта) і Аляксандр Воўк (студэнт 4-га курса таго ж факультэта).

Акрамя таго, адбыліся спаборніцтвы па плаванні, на якіх вызначалі пераможцаў унутры кожнага інтэрната.

# Навучацца ніколі не лішне

"Роля і месца дэканата і куратара ў сістэме выхаваўчай работы ў інтэрнаце" — так называўся семінар, які прайшоў 26 кастрычніка ў інтэрнаце № 6. Арганізаваў гэтае мерапрыемства студэнцкі гарадок БДУ.

Семінары – адзін з асноўных і ўжо традыцыйных відаў працы студгарадка. Яны закранаюць розныя сферы выхаваўчай дзейнасці – сацыяльна-педагагічную, культурна-масавую, спартыўна-аздараўленчую і псіхолага-педагагічную. Да ўдзелу ў такіх сустрэчах запрашаюцца намеснікі дэканаў факультэтаў па выхаваўчай рабоце, прадстаўнікі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, сацыяльныя педагогі, педагогі-псіхолагі, педагогі-арганізатары, інструктары па фізкультуры, прадстаўнікі грамадскіх маладзёжных арганізацый, органаў самакіравання. Такія семінары праводзяцца студгарадком штогод. І ўжо сёння праграма семінараў распісана на год наперад. Як адзначаюць арганізатары, "відаць зацікаўленасць людзей у такіх сустрэчах: шмат каго прываблівае магчымасць абмеркаваць мноства пытанняў, выказаць свае прапановы, выслухаць іншых, пагаварыць".

# "Хачу і Інтэрнэт, і крэслы..."

У кастрычніку ў інтэрнатах № 3, 6, 7, 10 нашага універсітэта прайшлі сустрэчы студэнцкага актыву з прадстаўнікамі адміністрацыі БДУ. На пасяджэнні "круглага стала" быў разгледжаны шэраг жыллёва-бытавых пытанняў, абмяркоўвалася праблема падключэння інтэрнатаў да сеткі Інтэрнэт (што асабліва хвалюе студэнтаў), было прынята рашэнне даабсталяваць пакоі сацыяльна-бытавога прызначэння.

У сустрэчах удзельнічалі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.Б. Аджаеў, намеснік прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях, дырэктар студэнцкага гарадка П.М. Бычкоўскі, намеснік дырэктара студгарадка па выхаваўчай рабоце А.С. Невар, загадчыкі інтэрнатаў, намеснікі дэканаў факультэтаў, прадстаўнікі маладзёжнага актыву.

У кожным інтэрнаце студэнтаў хвалявала вырашэнне "прыватных" праблем. Так, "сямёрка" цікавілася, як можна забяспечыць інтэрнат стацыянарнай апаратурай для дыскатэк. Шосты інтэрнат пытаўся, дзе здабыць лаўкі для хола. А студэнты інтэрната № 10 па-ранейшаму пакутуюць ад ужо традыцыйнай праблемы транспарту. Як адзначыў А.С. Невар, "пытанні, якія вымагаюць неадкладнага вырашэння, ужо вырашаюцца. Напрыклад, зараз загадчыкі інтэрнатаў атрымліваюць новыя крэслы, прыйшлі і новыя ложкі, а неўкамплектаваныя спартыўныя пакоі абсталёўваюцца дадатковым інвентаром".

*Крысціна СТАНКЕВІЧ,*
*кіраўнік інфармацыйнай службы*
*студэнцкага гарадка БДУ*

# ПЕРШЫНСТВО ПА БЕГУ

Прайшлі першыя спаборніцтвы Спартакіяды Белдзяржуніверсітэта 2000/2001 навучальнага года — першынство па бегу. Пераможцы вызначаліся асобна па дзвюх дыстанцыях у мужчын і жанчын. У камандным першынстве прызавыя месцы занялі юрыдычны, хімічны і механіка-матэматычны факультэты.

У забегу на 500 м пераможцамі сярод жанчын сталі Алена Лютаровіч (хімфак), Таццяна Чупрынская (эканамічны факультэт), Ганна Мурач (ФПМІ). У спаборніцтвах на 2000 м вызначыліся Алена Сырачынская (біяфак), Ірына Воўк (ФФСН), Наталля Гіль (біяфак).

Сярод мужчын прызёрамі ў бегу на 1000 м сталі Павел Кастрыкін (юрфак), Павел Царук (ФПМІ), Аляксандр Рыбак (хімфак). А ў спаборніцтвах на 3000 м месцы пераможцаў занялі Антон Бурмялёў (ФМА), Генадзь Ісакаў (хімфак), Аляксандр Мядзведзеў (факультэт радыёфізікі і электронікі).

# САМБА НА КАНАРАХ

На Канарскіх астравах у кастрычніку прайшло першынство свету па барацьбе самба сярод юніёраў. Сярод пераможцаў апынуліся і нашыя студэнты: Сяргей Ждан заваяваў срэбраны медаль, а Сяргей Шундзікаў стаў бронзавым прызёрам.

# СПАБОРНІЦТВЫ СЯРОД ВНУ

У Гомелі скончылася першынство Рэспублікі Беларусь сярод ВНУ па футболе. Зборная каманда нашага універсітэта заняла трэцяе месца ў сваёй падгрупе.

На трэцім месцы апынулася і нашая дзявочая каманда на аналагічным першынстве краіны па баскетболе.

# АДКРЫТЫ КУБАК МІНСКА ПА АРМРЭСТЛІНГУ

На спартыўнай базе нашага універсітэта прайшоў адкрыты Кубак Мінска па армрэстлінгу сярод жанчын і мужчын. У барацьбе за першае месца прынялі ўдзел больш за 120 спартсменаў з Мінска, Мінскай вобласці, а таксама Баранавіч і Рэчыцы.

Упершыню спаборніцтвы праводзіліся ў адзінаборстве на правую і левую руку і ў залік ішла сума ачкоў, набраная атлетамі абедзвюма рукамі.

Першае месца з вялікім адрывам заняла зборная каманда БДУ. Атлеты спортклуба нашага універсітэта былі першымі ў 6 з 11 катэгорый.

Пераможцамі Кубка горада ў вагавых катэгорыях сталі: да 55 кг — прызёр чэмпіянату РБ Цімур Лабус (хімфак), да 60 кг — чэмпіён Беларусі выпускнік БДУ Аляксандр Біндзіч, да 65 кг — Мікалай Васьковіч (ФПМІ), да 80 кг — шасцікратны чэмпіён РБ выпускнік БДУ Дзяніс Семяніда, да 85 кг — Сяргей Сасноўскі (фізфак), да 110 кг — сямікратны чэмпіён Беларусі Дзмітрый Кірыленка, звыш 110 кг — Андрэй Рамашэўскі (факультэт радыёфізікі і электронікі).

Галоўны суддзя спаборніцтваў, заслужаны трэнер Беларусі, суддзя міжнароднай катэгорыі, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Віктар Кавалёў зазначыў, што армрэстлінг карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў універсітэта. Каманда БДУ ўжо на працягу многіх гадоў мацнейшая не толькі ў Мінску, але і ў краіне. І нягледзячы на тое, што сёлета скончылі навучанне 5 майстроў спорту, прыток маладых сіл дазволіць захаваць традыцыі і годна прадстаўляць спартыўны клуб нашага універсітэта на спаборніцтвах самага рознага ўзроўню.

*Надзея БАЛДЗІНА*

***Ад рэдакцыі.*** *Жадаючыя рэгулярна займацца якім-небудзь відам спорту могуць звяртацца да адказных за арганізацыю фізвыхаваўчай і спартыўна-масавай работы на факультэтах (для студэнтаў) альбо да старшынь прафбюро (для супрацоўнікаў).*



# *Каб не марнаваць час...*

Не так даўно змяніўся расклад руху аўтобуснага маршруту № 47 — адзінага аўтобуса, які ходзіць ад плошчы Незалежнасці да філіяла БДУ ў Шчамысліцы. Для таго, каб студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта, што жывуць і працуюць у гэтым раёне, не марнавалі час на прыпынках, мы змяшчаем расклад у гэтым нумары газеты.

| *Плошча Незалежнасці — філіял БДУ* | *Філіял БДУ — плошча Незалежнасці* |
|---|---|
| 5.57 | 6.33, 6.55 |
| 6.19, 6.41 | 7.17, 7.39, 7.55 |
| 7.03, 7.19, 7.35, 7.52 | 8.11, 8.28, 8.45 |
| 8.09, 8.25, 8.43 | 9.01, 9.19, 9.41 |
| 9.05, 9.27, 9.49 | 10.03, 10.25, 10.47 |
| 10.06, 10.42 | 11.18, 11.49 |
| 11.13, 11.43 | 12.22, 12.55 |
| 12.19, 12.50 | 13.26 |
| 13.25, 13.52 | 14.01, 14.28, 14.52 |
| 14.16, 14.50 | 15.26, 15.54 |
| 15.16, 15.36, 15.58 | 16.12, 16.34 |
| 16.20, 16.42 | 17.18, 17.40 |
| 17.04, 17.26, 17.48 | 18.02, 18.24, 18.46 |
| 18.10, 18.27, 18.54 | 19.30 |
| 19.11, 19.55 | 20.27 |
| 20.35 | 21.11, 21.44 |
| 21.08, 21.41 | 22.17, 22.50 |
| 22.14, 22.47 | 23.23, 23.56 |
| 23.20, 23.55 | 0.29 |



# *Прафілактыка для студэнтаў*

Строгая вымова... Пазбаўленне права пражывання ў інтэрнаце... Незасяленне ў наступным годзе... Хадайніцтва перад рэктаратам БДУ аб адлічэнні з універсітэта...

Спакойна, спадарства, гэта не Halloween. Часцей за ўсё, гэта тое, што ідзе следам за такім шумным святам-разгулам нечысці (дый за некаторымі іншымі святамі таксама). Каб выратаваць усіх зацікаўленых ад такой незайздроснай долі, у студэнцкім гарадку працуе Савет па прафілактыцы (афіцыйная назва — Савет па прафілактыцы парушэнняў Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах Белдзяржуніверсітэта). У яго ўваходзяць прадстаўнікі студсаветаў інтэрнатаў, грамадскіх арганізацый БДУ (Студэнцкага саюза, прафсаюза), маладзёжны актыў універсітэта. У лістападзе прайшло першае пасяджэнне гэтага Савета ў абноўленым складзе.

У тых, хто жыве ў інтэрнатах, часцяком узнікае мноства праблем і пытанняў. І вырашыць іх для іншагародніх студэнтаў не менш важна, чым вучыцца. Гэта разумеюць і ў кіраўніцтве студгарадка. У сваім выступе на пасяджэнні Савета намеснік дырэктара студгарадка па выхаваўчай рабоце А.С. Невар зазначыў: "У студэнцкім гарадку сур'ёзна ставяцца да пытанняў пражывання студэнтаў. Мы разумеем, што рашэнні аб пражыванні/непражыванні павінны быць сур'ёзнымі, добра ўзважанымі і абгрунтаванымі".

Савет па прафілактыцы займаецца разглядам найбольш складаных персанальных спраў, калі студсавет інтэрната па нейкіх прычынах не можа прыняць рашэнне. Здараецца, студэнт лічыць, што яго пакаралі занадта сурова, і падае ў Савет заяву аб пераглядзе справы. А часам адміністрацыі здаецца, што з вінаватым абышліся занадта мягка, і тады яна піша Савету службовую запіску на парушальніка.

Аднак Савет не толькі разглядае спрэчныя справы. Ён закліканы яшчэ і прадухіляць парушэнні Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах. Дзеля гэтага ён арганізуе адпачынак студэнтаў: праводзіць культурна-масавыя і спартыўна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

Таму, шаноўнае спадарства, калі вам трэба даведка ці дапамога — звяртайцеся ў Савет па прафілактыцы.

*Крысціна СТАНКЕВІЧ,*
*кіраўнік інфармацыйнай службы студэнцкага гарадка БДУ*

# Экалогія на мяжы стагоддзяў

Калі ўявіць усю гісторыю Зямлі ў выглядзе аднаго каляндарнага года (365 дзён), то ў гэтым маштабе можна сказаць, што палеазой пачынаецца толькі 13 кастрычніка, гамініды з'яўляюцца ўвечары 31 снежня, а homo sapiens — у 23 гадзіны 59 хвілін 59,9155 секунд. Аднак з самых першых момантаў свайго з'яўлення як біялагічнага віду чалавек стаў аказваць уплыў на навакольнае асяроддзе. Зразумела, моц гэтага ўплыву з цягам часу змянялася.

Найбольш слабым быў гэты ўплыў падчас развіцця першабытнага грамадства. 300 000 год таму, у эпоху абледзянення, з'явіліся неандэртальцы. Гэта былі першыя гамініды, якія прыстасаваліся трываць цяжкасці доўгай зімы. Першыя прадстаўнікі гамінідаў былі неад'емнай часткай прыроды і поўнасцю залежалі ад яе. Па меры далейшага свайго развіцця чалавек усё больш і больш ізаляваў сябе ад прыроды. Гэтаму спрыяла захаванне агню, вынаходніцтва вопраткі, будаванне жытла. Аднак да цяжкіх умоў ледавіковай эпохі змаглі прыстасавацца толькі самыя прагрэсіўныя віды гамінідаў — краманьёнцы, а неандэртальцы зніклі з гістарычнай арэны. У выніку гэтага прыстасоўвання каля 10—15 тысяч гадоў таму чалавек засяліў увесь свой цяперашні арэал, за выключэннем Антарктыды. Цяжка сказаць, на якім узроўні знаходзіўся экалагічны светапогляд неандэртальца і краманьёнца, але першымі элементамі іх экалагічнай культуры былі сакральныя табу, што накладаліся на крыніцы і гэтым самым захоўвалі іх ад забруджвання. Дарэчы, менавіта ў гэты час з'явіліся і першыя экалагічныя крызісы, праўда, пакуль што ў лакальных маштабах. Неасцярожнае карыстанне агнём прыводзіла да таго, што выгаралі вялікія прасторы лясной расліннасці. Пераход да збіральніцтва прыводзіў да вытоптвання расліннасці вакол першых паселішчаў чалавека. Першым відам жывёльнага свету, які стаў ахвярай чалавека, быў пячорны мядзведзь, вынішчаны ў выніку канкурэнцыі за жытло. Таксама не без дапамогі чалавека тлустая кропка была пастаўлена на так званай мамантавай фауне. Аднак абмежаванасць тэхнічных сродкаў пакуль не дазваляла чалавеку вычарпаць прыродныя рэсурсы, таму яго ўздзеянне на навакольнае асяроддзе было досыць пасіўным.

Да часу ўзнікнення першых цывілізацый у шумераў (прыкладна 13 000 гадоў таму) названыя тэндэнцыі ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды захоўваліся. Назапашванне экалагічных ведаў ішло метадам спробаў і памылак. Аднак у 6—4 тысячагоддзі да нашай эры з'явіліся земляробства і жывёлагадоўля, што значна ўзмацніла ўплыў чалавека на навакольнае асяроддзе.

2500 гадоў таму на Зямлі было ўжо каля ста мільёнаў жыхароў. Неабходнасць абараняцца ад ворагаў прывяла да ўзнікнення каменных сцен вакол паселішчаў, якія і самі сталі значна буйнейшымі — горад Іерыхон, напрыклад, налічваў у тыя часы каля 6000 жыхароў. Зямлянкі саступілі места хацінам. У выніку пачаў фарміравацца гарадскі лад жыцця.

Узнікненне гарадоў і гарадскі лад жыцця з экалагічнага гледзішча былі не менш важнымі, чым узнікненне земляробства: упершыню чалавек стварыў свой асабісты свет, дзе галоўная роля адводзілася не прыродным, а сацыяльным законам.

Гарады першых цывілізацый па ступені адасобленасці ад прыроды былі падобныя да сучасных. Вакол іх актыўна будаваліся каналы і фарміраваліся аграландшафты.

Зразумела, што ўзмацненне ціску не магло не даць негатыўнага адбітку ў навакольным асяроддзі: узніклі працэсы эрозіі і засалення глебы, пачалося апустыньванне. Празмернае будаўніцтва каналаў у Месапатаміі паабапал Вавілона прывяло да з'яўлення зоны экалагічнай катастрофы са значнымі прыкметамі ўсіх вышэйназваных працэсаў.

Высновы, аднак, былі зроблены. Знакаміты цар Хамурапі выдаў звод законаў з рэгламентацыяй, колькі, калі і хто можа карыстацца вадой з каналаў — нешта кшталту сучаснага Воднага кодэкса.

У часы Рымскай імперыі ўплыў чалавека на прыроду яшчэ больш узмацніўся. Пастаянныя войны патрабавалі вялізных рэсурсаў. Як лічыцца, у выніку высякання міжземнаморскага цісу на лукі для войска плошчы лясоў у Міжземнамор'і скараціліся, а перавыпас свойскай жывёлы ў раёне сучаснай Сахары прывёў разам з іншымі фактарамі да з'яўлення самай вялізнай пустыні свету. Выкарыстанне міжземнаморскага падвіду слана непасрэдна ў баявых аперацыях паслужыла прычынай поўнага знікнення гэтых жывёл. Рымляне таксама стварылі шырока разгалінаваную сетку дарог, будавалі масты і акведукі, а па сістэме водаправоду ў Рым штодзённа падавалася да 1 тыс. $м^3$ вады ў дзень.

Першым рэальным пацвярджэннем звестак пра экалагічныя крызісы ў час старажытных цывілізацый з'яўляецца Біблія. Гэтыя сведчанні шмат у чым пацвярджаюцца наскальнымі малюнкамі і сучаснымі касмічнымі здымкамі. Акрамя войнаў і няправільнага вядзення сельскай гаспадаркі, прычынамі гэтых бедстваў служыў і гандаль па вядомых шляхах. Лічыцца таксама, што актыўнае выпальванне натуральнай лясной расліннасці пад пашу прывяло да шырокага распаўсюджвання стэпавай расліннасці на зямным шары.

Сярэднявечча характарызуецца паглыбленнем чалавечага ўздзеяння на прыроду. Найбольшы ўплыў працягвае адчуваць біясфера. Ідзе знікненне адных і катастрафічнае змяншэнне колькасці іншых відаў жывёл. Паступова ўзнікаюць ідэі аховы прыроды ад чалавека. Так, праз збядненне дзічынай Белавежская пушча ў часы ВКЛ была, фактычна, абвешчана запаведнай — паляваць тут дазвалялася толькі вялікаму князю і яго атачэнню.

У эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў чалавек стаў больш поўна ўяўляць сабе памеры сушы, што стала крыніцай міфа пра невычэрпнасць зямных рэсурсаў. Аднак ужо з XVIII—XIX стагоддзяў гэтая думка стала пераглядацца — узніклі новыя павевы, звязаныя са з'яўленнем першых задакументаваных экалагічных крызісаў. Назіраецца глабалізацыя экалагічных праблем. Інтэнсіўна знішчаюцца балоты, лясы, знікаюць многія прадстаўнікі расліннага і жывёльнага свету. Разам з гэтым паступова прыходзіць усведамленне таго, што такія змены моцна адбіваюцца на здароўі людзей.

За апошняе стагоддзе спажыванне прыродных рэсурсаў павялічылася ў сотні разоў. На аднаго жыхара прыпадае каля 20 тон сыравіны ў год. Яна перапрацоўваецца ў канцавыя прадукты масай да 2 тон, а непасрэдна спажываецца толькі 1 тона, астатняе зноў вяртаецца ў навакольнае асяроддзе ў выглядзе разнастай-



нага смецця. Чалавек навучыўся сінтэзаваць каля 8000 розных рэчываў, многія з якіх не толькі не сустракаюцца ў прыродзе, але і не могуць быць перапрацаваныя ёй (напрыклад, поліэтылен, пластыкі). Дзякуючы цяжкой тэхніцы чалавек па сваім уздзеянні на літасферу зараз дасягае ўзроўню геалагічных стыхій. У выніку, перамяшчаюцца тысячы кубаметраў парод, фармуюцца тэхнагенныя ўпадзіны кар'ераў і горы з пустой пароды — тэрыконы. Наступствы гэтых з'яваў — глабалізацыя экалагічных праблем.

Чалавек праз шырокае развіццё тэхнікі, тэхналогіі, адукацыі і аховы здароўя значна аддаліўся ад прыроды. На яго ўжо не ўплывае фактар натуральнага адбору, а галоўным ворагам для цывілізацыі становіцца сама цывілізацыя, бо на мяжы тысячагоддзяў чалавецтва стаіць побач з глабальным экалагічным крызісам. Сёння чалавек за год перамяшчае з аднаго месца на другое 10 тыс. км$^3$ горных парод — столькі, колькі ўсе прыродныя рэльефаўтваральныя працэсы. Аднак ёсць і вялікая розніца: прыродныя працэсы раўнамерна распаўсюджваюцца па ўсёй тэрыторыі зямнога шару, а тэхнагенныя — адбываюцца на абмежаваных участках. Кожны год з нетраў здабываецца да 100 млрд. тон розных парод руд, карысных выкапняў, будаўнічых матэрыялаў і іншых відаў мінеральнай сыравіны. На пачатку XXI стагоддзя гэтая лічба можа дасягнуць 500—600 млрд. тон, а пітной вады, напрыклад, спатрэбіцца звыш 30 тысяч км$^3$. Найбольш моцныя ядзерныя выбухі, што праводзяцца зараз у навуковых мэтах, сувымерныя з сейсмічнымі штуршкамі магнітудай да 7,3 балаў. Таму сёння вялікая ўвага надаецца міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне экалогіі.

Аднак кожнаму з нас важна павышаць і свой асабісты ўзровень экалагічнай культуры і памятаць, што менавіта ад нас саміх шмат у чым залежыць стан навакольнага асяроддзя, у якім мы жывем. Чалавецтва на сваім гістарычным шляху ўжо зрабіла шмат памылак і проста не можа сабе дазволіць яшчэ адной серыі такіх жа, але на больш высокім тэхнічным узроўні: гэта падвядзе рысу не толькі пад гісторыяй біялагічнага віду homo sapiens, але і пад усёй гісторыяй жыцця на Зямлі.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геафака БДУ*

**СЛОВА СТУДЭНТУ**

# НЕ КУРЫЦЬ – МОДНА?

*Моладзь заўсёды мела і мае мноства разнастайных праблем. З некаторымі яна спрабуе справіцца сама, з іншымі – пры дапамозе старэйшых. Пра сённяшнія маладзёжныя праблемы і шляхі іх вырашэння ў нашай новай рубрыцы разважае студэнт геаграфічнага факультэта, старшыня сацыяльнай камісіі прафкома студэнтаў БДУ Віталь Мічкоў.*

*Першы яго артыкул, які мы публікуем у гэтым нумары газеты, прымеркаваны да Міжнароднага дня адмовы ад курэння, які адзначаўся 21 лістапада.*

Сёння праблема курэння стала, мабыць, самай актуальнай сярод беларускай моладзі. Ад хваробаў, звязаных з курэннем, у Беларусі штогод памірае 16 000 чалавек. У свеце ж ад тытунёвай прадукцыі штогод паміраe 3 мільёны чалавек. Гэта значыць, што кожныя 10 секундаў 1 чалавек паміраe ад цыгарэтаў.

Маё пакаленне можна смела назваць пакаленнем курцоў. Масавае курэнне бацькоў шмат у чым спрычынілася да таго, што сёння ў Беларусі толькі 10 % дзяцей і падлеткаў адносна здаровыя, а астатнія маюць сур'ёзныя адхіленні і паталогіі. Дый у нашым універсітэце на 1000 студэнтаў прыпадае 1056 хваробаў. Іншымі словамі, болей за адну на кожнага. А калі прыгадаць, што "прафесійнай" хваробе студэнтаў — гастрыту — цыгарэта дапамагае ператварыцца ў язву, за якой часцяком ідзе рак страўніка... Можна сказаць, што кожны, хто запаліў цыгарэту, аўтаматычна трапляе ў катэгорыю рызыкі анкалагічных, лёгачных, а таксама ўжо згаданых захворванняў страўнікава-кішачнага тракту.

Нягледзячы на тое, што з цяперашняй стыпендыяй выжыць даволі няпроста, студэнты ўсё ж каля 30 % яе выдаткоўваюць на цыгарэты. Дарагая і якасная прадукцыя ім не па кішэні, і таму найбольшай папулярнасцю пачынаюць карыстацца танныя, другасортныя маркі — максімальна шкодныя для здароўя.

Вынікі сацыялагічных апытанняў выглядаюць вельмі красамоўнымі: у ВНУ Беларусі кураць 65 % хлопцаў і кожная трэцяя дзяўчына. І гэта пры тым, што ў дзяўчат найбольш спрыяльны час для нараджэння дзіцяці — з 19 да 25 гадоў. Атрымліваецца ж, што менавіта на гэты ўзроставы прамежак прыпадае найбольшая колькасць курачых дзяўчат. Што ў выніку? Цяжарнай жанчыне курэнне пагражае выкідышам, прыроджанымі паталогіямі дзіцяці, хранічнымі хваробамі ў нованароджаных. Лепей, бадай, ужо зусім не нараджаць, чым потым змагацца за жыццё і здароўе дзіцяці...

Што можна супрацьпаставіць цыгарэтам? Усведамленне таго, што курэнне — гэта хвароба, якой можна пазбавіцца. Прыклад такіх паводзінаў — Нідэрланды: 800 000 чалавек адмовіліся ад курэння, прымеркаваўшы сваю адмову да святкавання 2000 года (гэты факт, дарэчы, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса). Чаму б і нам не арганізоўваць такія ж масавыя акцыі?..

Якія яшчэ шляхі барацьбы з курэннем можна выкарыстоўваць? На маю думку, неабходна забараніць адкрытую і схаваную рэкламу тытунёвых вырабаў, абмежаваць вытворчасць і імпарт нізкаякасных цыгарэт. Трэба забараніць курэнне ва ўсіх навучальных установах, грамадскіх месцах, месцах адпачынку і збору людзей (прыпынкі грамадскага транспарту, рынкі і г.д.). Мне могуць запярэчыць: маўляў, гэта ўсё ўжо даўно робіцца. Згодны, робіцца. Але дае мала плёну.

Ёсць і шляхі, якія пакуль практычна не скарыстоўваюцца альбо скарыстоўваюцца вельмі слаба. Трэба больш актыўна звяртацца да рэкламы: рыхтаваць даведачныя матэрыялы, памяткі пра шкоду курэння, відэазапісы на гэтую тэматыку для дэманстрацыі ў школах і іншых навучальных установах. Варта арганізоўваць "кірмашы здароўя" ў дашкольных установах і малодшых класах школы. У рэшце рэшт, папросту неабходна распрацаваць адзіную нацыянальную праграму барацьбы з курэннем.

Да арганізацыі ўсіх гэтых мерапрыемстваў неабходна падключаць і саму моладзь, у тым ліку і тых, хто курыць. Маладзёжныя арганізацыі, іх лідэры мусяць стаць прыкладам для сваіх равеснікаў, якім надакучылі натацыі дарослых. Гэта, на маю думку, найбольш эфектыўны спосаб.

Хочацца верыць, што неўзабаве настане той час, калі "быць як усе" і "быць модным" для моладзі Беларусі будзе азначаць — не курыць.

*Віталь МІЧКОЎ*

**КНІЖНАЯ ПАЛІЦА**

# *Паэзія, што грэе сэрца*

"Паэзія Якуба Коласа... грэе кожнае шчырае беларускае сэрца, трываліць, гартуе, бароніць, як аброчны крыж на раздарожжы, ад чужыншчыны". Так сцвярджае Р.І. Барадулін ва ўступным слове да кнігі Якуба Коласа "Мой родны кут...". Кнігі, створанай выдавецтвам "Мастацкая літаратура".

У выданне ўвайшлі найлепшыя і найбольш вядомыя вершы з паэтычнай спадчыны дзядзькі Якуба, а таксама некалькі раздзелаў з паэмы "Новая зямля". Нібы чуюцца са старонак кнігі знаёмыя кожнаму беларусу з дзяцінства "Родныя вобразы", "Не пытайце, не прасеце...", "Усход сонца". Хвалюе незабыўнай мелодыяй пяшчотнае "Мой родны кут...". І аптымізмам поўніцца душа пад упэўненае:

Дымам пойдзе ўсё ліхое,
Ўсё, што душыць нас і гне.
Вер, брат, — жыцце залатое
Будзе ў нашай старане.

Нягледзячы на заўвагу, што кніга прызначаецца для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, такому набытку будзе рады кожны аматар беларускай паэзіі.

*Завітала ў кнігарню*
*Вольга БАЗЫЛЕВА*

ПРАЕКТЫ

# Як жыццё? Давайце параўнаем

Ужо можна з упэўненасцю сказаць, што новы праект тэлекампаніі ФІТ, а менавіта эканамічная праграма "Як жыццё?", якая каля пяці месяцаў выходзіць на "Восьмым канале", апраўдаў надзеі сваіх аўтараў і ініцыятараў.

Адказваючы пры сустрэчы знаёмаму на такое звычайнае пытанне "Як жыццё?", кожны з нас мае на ўвазе нешта сваё, асабістае, што робіць яго шчаслівым, або няшчасным. Аднак усе мы пры гэтым успамінаем яшчэ і пра галоўны сродак існавання — грошы, якія даюць магчымасць адчуць стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Тэлекампанія ФІТ, ствараючы новую праграму, узяла гэтую нашу асаблівасць за аснову. І пачала рабіць цыкл эканамічных перадач на найбольш цікавыя і актуальныя для насельніцтва тэмы: пенсіянеры, банкі, прадпрымальнікі, інфляцыя, прыватызацыя, малы бізнес. Можа, таму яны займелі папулярнасць. Бо арыентавацца ў паўсядзённым жыцці нікому не зашкодзіць.

А перадача "Як жыццё?" да ўсяго яшчэ і параўноўвае сітуацыю, ход эканамічных рэформаў у трох краінах: Беларусі, Расіі, Украіне. І не толькі на прыкладзе голых лічбаў або небясспрэчных разваг. "Мы спрабуем раскрыць почасту складаныя эканамічныя праблемы праз гісторыю канкрэтных людзей. Адна справа сказаць, колькі, напрыклад, атрымоўвае пенсіянер у тых жа Расіі, Украіне, Беларусі. А іншая справа — паказаць рэальнага пенсіянера, які б расказаў пра сваё жыццё", — гаворыць Надзея Цвірко, кіраўнік гэтай праграмы і галоўны прадзюсер тэлекампаніі ФІТ.

Трэба сказаць, што любая з'ява ў сюжэтах разглядаецца з ўсіх бакоў. Адназначныя высновы не робяцца. А інфармацыя даецца для разваг. Атрымоўваецца такі адукацыйны экскурс на зададзеную тэму.

На аснове сюжэтаў робіцца экспертная ацэнка. Прычым у якасці экспертаў выступаюць не толькі эканамісты, але і сацыёлагі, філосафы, псіхолагі. Эканамічным сітуацыям даюць інтэрпрэтацыю і з гістарычнага пункту гледжання. Як бы звязваюць тыя працэсы, якія адбываюцца сёння, з гісторыяй, культурай, менталітэтам народаў трох дзяржаў. Поўную карціну дапамагаюць стварыць і мінісюжэты аб вопыце іншых краін. Дынаміку і настрой перадачы задае вядучая. Яна будуе яе лагічны ход і з'яўляецца своеасаблівым павадыром у зносінах паміж гледачамі, героямі сюжэтаў і экспертамі.

Як бачым, задумка праграмы — першапачаткова цікавая і няпростая. А калі ўлічыць, што перадача "Як жыццё?" выходзіць не толькі ў Мінску, але ў Кіеве і Краснаярску, то можна ўявіць, колькі прыйшлося аўтарам папрацаваць над яе стварэннем.

Да яе выхаду рыхтаваліся больш за паўгода. Спачатку патрэбна было знайсці партнёраў. Імі сталі з украінскага боку прадстаўніцтва "Інтэрньюс" у гэтай краіне, задача якога — работа з недзяржаўнымі электроннымі сродкамі масавай інфармацыі, а з расійскага — краснаярская кампанія "Афонтава". Потым узнікла патрэба наладзіць пастаянны механізм паступлення сюжэтаў з гэтых рэспублік. Пасля спатрэбілася стварыць на базе тэлекампаніі ФІТ своеасаблівы мазгавы цэнтр, які б адсочваў найбольш цікавыя для насельніцтва тэмы і каардынаваў работу. І гэта, здаецца, удалося.

Мяркуйце самі: кожную нядзелю дакладна ў дванаццаць гадзін выходзіць праграма з трыма сюжэтамі з трох краін, якія дапамагаюць нам разабрацца ў адной якой-небудзь з'яве. Хай гэта будзе малы бізнес, падаходны падатак, банкі, малая прыватызацыя,сярэдні клас або фермерства, платная медыцына, інфляцыя, беспрацоўе. Галоўнае, мы самі можам зрабіць нейкія высновы і яшчэ раз задумацца: а можа, не ўсё так безвыходна?

*Ганна ЛАГУН*

МАЙСТРОЎНЯ

**Вита ГОЛУБ,**
**11 "1 фил" класс Лицея БГУ**

***

Надо сделать глубокий вдох,
Разбежаться по крыше дома
И, раскинув, как крылья, руки,
Спрыгнуть вниз с серых глыб бетона.
Полной грудью вдыхая небо,
Лететь, не боясь ничего,
Оставляя грехи и сомненья
В пасти ужаса своего.
Понимая, что ты живой,
Сознавая, как это немало,
Ты почувствуешь всем собой
Всё, чего тебе не хватало.
Каждой порой всосешь высоту,
Растворяя свои униженья
В вдруг открывшейся глубине
Одуряющего паденья.

***

Мне надоело поступать как надо.
Как хочется цинично обмануть.
Ударить так, чтобы всю жизнь болело,
Плевать на всё, на всех рукой махнуть!
Я не хочу стареть, как все, упрямо...
Бояться — некрасиво и смешно!
Не знаю, почему мне так противно,
Но хочется, чтоб завтра всё прошло.

**Не любовь**

Ты мне нравишься, просто нравишься,
Но если ты завтра уйдешь,
То надолго в моей памяти останешься.
И мне жаль, что это не любовь.

**Роберт БЁРНС**

**Алая роза**

Моя любовь подобна алой розе.
Июнь раскрыл ей первый лепестки.
Моя любовь — в мелодии, не в прозе,
И звуки сладкие ее парят, как мотыльки.

С прекраснейшим искусством ты сравнима;
Настолько глубоко в тебя влюблен,
Что жизнь без твоих глаз невыносима,
Пока моря волнуются, как лен.

Пока живу, любимая, на свете,
Свет не растопит грозную скалу.
Ты для меня царица на планете,
Пока песок Бог не развеял, как золу.

Прощай, единственная роза,
Я не прощаюсь, но пока
Прощай, хоть за топазовые слезы
Пройду к тебе чрез землю и века.



**Мадригал**

Закат украденной зари и юность — как огонь и пламя:
Весна моя полна услады,
А старость гнется от забот.
Есть в юности от летней утренней прохлады,
А старость жжет нам руки, словно лед.

Рассвет судьбы подобен краскам лета,
А старость истощает организм.
Ах, молодость, твоим порывом я согрета,
Ведь остываем мы, и в этом весь трагизм.
Жар юных душ тогда не оскудеет
Наперекор холодной тишине,
Пока покорность телом всем не овладеет.
И дикий нрав волной шумит во мне,
Я ненавижу жуткий запах смерти,
Когда душа немеет от тоски,
Ведь мы все жизни нашей дети,
А жизнь, любовь и молодость близки.

**Перевод с английского Елены БИБИКОВОЙ, студентки II курса географического факультета БГУ**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1,5*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*23 лістапада*
*Зак. 779у*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша*